# На тым тыдні...

✓ **2 лістапада** у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася **юбілейная выстаўка Святланы Кастрыцы «Пространство и свет»**. Праект падрыхтаваны сумесна з Беларускім саюзам мастакоў і Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжам імя А.К. Глебава.

✓ **3 лістапада** у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася **выстаўка «Аўтограф»** выкладчыкаў Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Анастасіі Калацкай (жывапіс) і Вольгі Сямашка (кераміка), а таксама іх вучняў, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва».

Назва выстаўкі «Аўтограф» гаворыць аб тым, што аўтары – мастакі і выкладчыкі – праз сваю дзейнасць пакідаюць у сэрцах гледачоў і вучняў аўтографы. Імі з'яўляецца і асобны твор, народжаны ў любові і шчодрасці, і ўся творчасць – аўтарская спадчына.

✓ **3 лістапада** у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбыўся **творчы вечар «Ніна Лістота. Нараджэнне паэта»**. Маладая паэтка Н. Лістота ўпершыню выступіла з уласнай праграмай. Аўтар жыве і працуе ў Мінску, аднак яе паэтычную творчасць добра ведаюць у родным Маладзечне. Там яе творы гучалі на многіх пляцоўках і займелі сваіх прыхільнікаў. Творы аўтаркі друкаваліся ў газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Маладосць», «Бярозка». Падборкі вершаў змяшчаліся ў зборніках моладзевай літаратуры «Час жыць!». Таксама цыкл твораў Н. Лістоты перакладзеныя на ўкраінскую мову Пятром Сяленкім і апублікаваныя ва ўкраінскім літаратурным часопісе «Київ».

✓ **3 лістапада** у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **XXX міжнародная навуковая канферэнцыя «Каласавіны»**, прысвечаная 110-годдзю творчай дзейнасці Якуба Коласа. З 1985 г. кожную восень у дзень нараджэння паэта дом-музей збірае прадстаўнікоў навуковага коласазнаўства з усёй Беларусі і краінаў блізкага замежжа з мэтай даследавання і ўсебаковай прапаганды творчасці Песняра. Сёлета акрамя беларускіх навукоўцаў у канферэнцыі ўдзельнічалі супрацоўнікі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, сталічных і абласных ВНУ, музеяў, а таксама госці з Польшчы, Літвы, Расіі і Украіны.

Адмыслова да юбілею канферэнцыі была падрыхтавана выстаўка з музейных фондаў, дзе прадстаўлены падарункі музею за апошнія 5 гадоў ад мастакоў, калекцыянераў, літаратараў і проста неабыякавых людзей – мастацкія працы, кнігі з дарчымі надпісамі, рукапісы і інш.

✓ **4 лістапада** Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа запрасіў ахвочых на **XXXI літаратурна-музычнае свята «Каласавіны»**. Удзельнікі наведалі выстаўку, прысвечаную 110-годдзю творчай дзейнасці народнага паэта і юбілею яго знакамітых твораў, якая размясцілася ў Стаўбцоўскай дзіцячай бібліятэцы імя Якуба Коласа. Сёлета, да 65-годдзя з дня свайго заснавання, бібліятэка атрымала новы статус і імя знакамітага земляка.

У мемарыяльнай сядзібе «Альбуць» адбылося адкрыццё новай экспазіцыі з інтэрактыўнымі зонамі «Прырода ў творчасці Якуба Коласа», дзе наведнікі змогуць спазнаць і адчуць таямніцы прыроды.

✓ **4 лістапада** у рамках Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адкрылася **выстаўка «Фільмы Анджэя Вайды ў сусветным кінаплакаце»**, падрыхтаваная сумесна з Музеем кінематаграфіі ў Лодзі і Польскім інстытутам у Мінску. Тады ж адбыўся паказ фільма «Бесы» (2013 г., рэжысёр А. Вайда).

✓ **5 лістапада** Дом-музей I з'езда РСДРП, філіял Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, адкрыў **абноўленую экспазіцыю да 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі**. У новай экспазіцыі больш глыбока раскрыты тэмы гісторыі з'езда і яго ўдзельнікаў, жандарскага вышуку, грамадска-палітычных рухаў канца XIX – пачатку XX ст., штодзённага жыцця губернскага Мінска, гісторыі стварэння і дзейнасці самога музея, які вядомы яшчэ і тым, што тут у 1920-я гг. жылі літаратары Янка Купала і Змітрок Бядуля.

✓ **6 лістапада** у Парку гісторыі «Сула» (в. Сула Стаўбцоўскага раёна) прайшоў **першы фэст традыцыйнай беларускай нацыянальнай кухні «Чарка-шкварка на Суле»**. У межах фэсту можна было пакаштаваць традыцыйныя беларускія стравы, прыгатаваныя па арыгінальных старадаўніх рэцэптах. Дзейнічалі дзве вялікія тэматычныя пляцоўкі: «Шляхетны пір» – зона шляхецкай, арыстакратычнай кухні ды напояў і «Сялянскі падворак» – народная ліцвінская кухня і напоі. Таксама госці маглі паўдзельнічаць у кулінарных майстар-класах, якія вёў кіраўнік Гільдыі кухараў і шэф-кухараў Беларусі Аляксандр Чыкілеўскі.


*Фота Анатоля МЯЛЬГУЯ*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ